АРК

# Весці БДПУ

Штоквартальны навукова-метадычны часопіс.
Выдаецца з чэрвеня 1994 г.

№ 4(54) 2007

СЕРЫЯ 2.
Гісторыя. Філасофія. Палiталогія. Сацыялогія.
Эканоміка. Культуралогія

## Змест

*Галоўны рэдактар:*
П. Дз. Кухарчык

*Рэдакцыйная калегія:*
Н. Г. Алоўнікава
А. І. Андарала
(*нам. галоўнага рэдактара*)
У. В. Амелькін
В. А. Бондар
М. К. Буза
В. В. Бушчык
(*нам. галоўнага рэдактара*)
Ю. А. Быкадораў
(*нам. галоўнага рэдактара*)
І. Бялько
А. М. Вітчанка
С. Я. Гайдукевіч
К. У. Гаўрылавец
А. А. Груцкі
В. М. Дабранскі
Л. М. Давыдзенка
А. В. Данільчанка
М. М. Забаўскі
В. Б. Кадацкі
Я. Л. Каламінскі
У. М. Калюноў
Л. В. Камлюк
Л. А. Кандыбовіч
І. В. Катляроў
П. В. Кікель
Г. А. Космач
У. М. Котаў
Н. І. Кунгурава
М. В. Лазаковіч
І. Я. Левяш
М. І. Ліставад
А. М. Люты
У. А. Мельнік
І. А. Н...
В. М...
А. І. ...
В. Д...
В. Б...
А. І. ...
І. С. ...
В. М...

Весці БДПУ
сер 2. н 4. 2007

### Гісторыя

*Шаўчук І.І.* Дынаміка колькаснага складу аспірантуры па гуманітарных дысцыплінах (20–30-я гг. XX ст.) ..... 3

*Здановіч У.В.* Падрыхтоўка кадраў вышэйшай кваліфікацыі па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1990–2005 гг.) ..... 7

*Помазаў С.В.* Сацыяльны і нацыянальны склад навучэнцаў прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў БССР у першай палове 1920-х гг. ..... 13

*Мініцкі М.І.* Гістарычныя адукацыйныя веды: роля кагнітыўных практык ..... 18

*Вуглік І.Р.* Сацыяльна-дэмаграфічныя характарыстыкі беларускага сялянства XVIII ст. ..... 22

*Русецкі С.В.* Вывучэнне традыцый дабрачыннасці ва ўсходніх славян у беларускіх, расійскіх і ўкраінскіх даследаваннях XIX – пачатку XXI ст. ..... 25

*Атрушкевіч М.М.* Гільдзейскае заканадаўства ў Беларусі ў 20-я гг. XIX ст. ..... 30

*Лаўрыновіч Д.С.* Віленскія акцябрысты і іх саюзнікі ў пачатку XX ст. .. 33

*Вараб'ёў А.А.* Да пытання аб выніках выбараў ва Устаноўчы сход у Гарадоцкім павеце Віцебскай губерні ..... 37

*Крыварот А.А.* Узаемадзеянне беларускіх і расійскіх партызан (1941–1944): гістарыяграфія за 1941–1965 гг. ..... 40

*Вялікі А.Ф.* Савецка-польскае Пагадненне аб рэпатрыяцыі ад 25 сакавіка 1957 г. як нарматыўна-прававая база рэпатрыяцыі палякаў з БССР у Польшчу ..... 45

*Папоў М.А.* Дапаможныя біскупы Магілёўскага рымска-каталіцкага архібіскупства ў эпоху мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча (1773–1826 гг.) ..... 50

*Скарабагатая І.А.* Нацыянал-сацыялістычны рух у Аўстрыі (1920-я гг.) ..... 55

### Філасофія

*Кікель П.В., Абалевіч І.В.* Беларускі шлях развіцця: праблемы і перспектывы ..... 60

*Таркан І.І.* Канцэпцыі дыялога культур у рускай філасофскай думцы другой паловы XX ст. ..... 63

*Ігнатовіч А.Л.* Неасакратаўская размова ў кантэксце развіцця кагнітыўнай навукі другога пакалення ..... 66

### Паліталогія

*Сіманоўскі І.С.* Метады экстрапаляцыі і параўнальнага аналізу ...народных адносін ..... 69

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

6. Каваленя, А.А. Моладзь Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / А.А. Каваленя // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. – Мінск: Бел. навука, 1999. С. 123 – 162.
7. Ки[illegible], М.К., Звездаева, В.А. Гришинцы. Из истории особого партизанского отряда «Тринадцать» Героя Советского Союза С.В. Гришина / М.К. Ки[illegible], В.А. Звездаева. – Смоленск : Смоленское книжное издательство, 1958. – 105 с.
8. Краўчанка, І.С. Камсамол Беларусі ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941 – 1944 гг.) / І.С. Краўчанка. – Мінск, Дзярж. выд. БССР, 1958. – 48 с.
9. Краўчанка, І.С. Работа Кампартыі Беларусі ў тылу ворага (1941 – 1944) І.С. Краўчанка. – Мінск, Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1959. – 176 с.
10. Кравченко, И.С., Шевела, Г.Н. В боях за Родину (июнь 1941 года – 1945 год) // Комсомол – нашей доблестной партии сын / ред. А.К. Зинин, А.А. Марке[illegible]. – Минск: Госиздат БССР, 1960. – С. 256 – 322.
11. Лабанок, У.Е. Большэвікі Віцебшчыны–організатары барацьбы працоўных вобласці супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў / У.Е. Лабанок // Большэвік Беларусі. – 1952. – № 1. – С. 36 – 50.
12. Липило, П.П. КПБ – организатор и руководитель партизанского движения в Белоуссии в годы Великой Отечеств. Войны / П.П. Липило. – Минск, Госиздат БССР, 1959. – 260 с.
13. Літвін, А.М. Стварэнне і баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі / А.М. Літвін // Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: Праблемы гістарыяграфіі і крыніцазнаўства. – Мінск: Бел. навука, 1999. – С. 90–122.
14. Макаров, Н.И. Партизанские были / Н.И. Макаров. – Калинин, 1959. – 136 с.
15. Партизанская борьба с немецко-фашиятскими оккупантами на территории Смолещины 1941 – 1943: Документы и материалы. – Смоленск : Кн. изд., 1962. – 520 с.
16. Пономаренко, П.К. Партизанская война в Белоруссии / П.К. Пономаренко // Партийное строительство. – 1943. – № 3. – С. 36–42.
17. *Пономаренко, П.К.* Партизанская война в тылу врага / П.К. Пономаренко // Партизанское движение в Белоруссии.– М.: Госполитиздат, 1943. С. 35–42.
18. *Сарченко, Г.Ф.* В огне народной войны / Г.Ф. Сарченко. – Псков, 1962. –164 с.
19. *Сарченко, Г.Ф.* В строю бессмертных / Г.Ф. Сарченко. – Псков, 1964. – 276 с.
20. *Сарченко, Г.Ф.* Из истории боевого содружества русского, белорусского и латышского народов в тылу врага в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1944 гг. АКД / Г.Ф. Сарченко.– М., 1963. – 30 с.
21. Советские партизаны. Из истории партизанского движения в годы Великой Отечеств. Войны: сб. ст. – М., Госполтиздат, 1961.
22. Советские партизаны. Из истории партизанского движения в годы Великой Отечеств. войны: сб. ст. – 2-е испр. и доп. изд. – М, Гослитиздат, 1963.
23. *Цанава, Л.* Всенародная партизанская вайна в Белоруссии против фашистских захватчиков. Ч. 1. / Л. Цанава. – Минск. Госиздат БССР, 1949. – 414 с.
24. *Цанава, Л.* Всенародная партизанская борьба в Белоруссии против фашистских захватчиков. Ч. 2. / Л. Цанава. – Минск: Госиздат, 1951. – 1034 с.
25. *Шевелева, Е.* Партизанка Леля Колесова / Е. Шевелева // Вечно живые. – М. : Молодая гвардия, 1958. С. 219 – 226.
26. *Шчарбатаў, Г.М.* Камсамол Беларусі ў баях за Радзіму / Г.М. Шчарбатаў. – Мінск: Дзярж. выд. БССР, 1950. – 60 с.
27. *Шчарбатаў, Г.М.* Камсамол Беларусі ў баях за Радзіму / Г.М. Шчарбатаў. – Мінск, Дзярж. выд. БССР, 1957. – 84 с.



SUMMARY

*The problem of illumination is explored in historical literature for 1965 coperation of the Byelorussian and Russian partisan formings duriny the Great Patriotic war (1941–1944). The author analyses united activities of partisan forces in nearby republics.*


УДК 947.084.8


***А.Ф. Вялікі,***

***кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ***


# САВЕЦКА-ПОЛЬСКАЕ ПАГАДНЕННЕ АБ РЭПАТРЫЯЦЫІ АД 25 САКАВІКА 1957 г. ЯК НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВАЯ БАЗА РЭПАТРЫЯЦЫІ ПАЛЯКАЎ З БССР У ПОЛЬШЧУ

Абмен насельніцтвам паміж БССР і Польскай Рэспублікай у 1944–1946 гг. і рэпатрыяцыя палякаў з БССР у Польскую Народную Рэспубліку ў 1955–1957 гг. сталі важнейшымі фактарамі беларуска-польскіх і польска-беларускіх міждзяржаўных, дыпламатычных адносін у перыядзе 40 – 50-х гг. XX ст. Аднак, калі ўмовы падпісання і змест беларуска-польскага Пагаднення ад 9 верасня 1944 г. падрабязна прааналізаваны ў айчыннай гістарыяграфіі [1; 5–6], то савецка-польскаму Пагадненню ад 25 сакавіка 1957 г. прысвечаны толькі энцыклапедычныя артыкулы і фрагментарныя ўзгадванні [1–2; 6; 9]. Польскія гісторыкі звярталі ўвагу на савецка-польскі «кантэкст» Пагаднення, не аналізуючы яго змест і значэнне для працэсу рэпатрыяцыі палякаў з БССР у Польшчу [9–11]. Разам з тым Пагадненне ад 25 сакавіка 1957 г. з'яўлялася асноўнай нарматыўна-прававой базай, на аснове якой ажыццяўлялася рэпатрыяцыя беларускіх палякаў у ПНР у 1957–1959 гг. Таму мэтай напісання артыкула з'яўляецца аналіз умоў падпі-

сання і змест савецка-польскага Пагаднення ад 25 сакавіка 1957 г. і яго значэнне для рэпатрыяцыі палякаў з БССР у Польшчу.

Важнае значэнне ў рашэнні праблемы рэпатрыяцыі палякаў з СССР у Польшчу меў візіт партыйна-ўрадавай дэлегацыі ПНР у Маскву, які адбыўся 15–18 лістапада 1956 г. Па яго выніках бакі «дамовіліся аб прынцыпах, на аснове якіх адпаведныя дзяржаўныя органы Савецкага Саюза будуць спрыяць далейшай рэпатрыяцыі палякаў, якія маюць сем'і ў Польшчы, і вяртанню ў Польшчу тых, хто па незалежных ад яго прычынах не мог выкарыстаць права на рэпатрыяцыю на аснове савецка-польскага Пагаднення 1945 г. У бліжэйшы час адбудуцца сустрэчы прадстаўнікоў кампетэнтных органаў абодвух бакоў, для ўзгаднення тэрмінаў і парадку рэпатрыяцыі» [4, с.79]. У адпаведнасці з гэтымі рашэннямі эксперты абодвух бакоў пачалі падрыхтоўку неабходных дакументаў, да маючых адбыцца ў наступным годзе заключных перамоваў і падпісання Пагаднення аб рэпатрыяцыі.

Галоўная роля ў выпрацоўцы адпаведных дакументаў належала міністэрству замежных спраў ПНР, якое ў снежні 1956 г. падрыхтавала праект пагаднення, які меў назву: «Умовы паміж Урадам Польскай Рэспублікі і Урадам СССР у справе рэпатрыяцыі пэўных катэгорый былых польскіх грамадзян з тэрыторыі СССР». Праект умовы вызначаў шэсць катэгорый грамадзян, якія мелі права на рэпатрыяцыю [11, s. 136]. Аднак самым галоўным і прынцыповым, што мела непасрэднае дачыненне да палякаў, якія пражывалі ў БССР, з'яўлялася тое, што такое права мелі грамадзяне рэспублікі, якія па нацыянальнасці з'яўляліся палякамі і яўрэямі і мелі падданства Другой Рэчы Паспалітай да 17 верасня 1939 г. Не менш важным і істотным з'яўлялася палажэнне аб так званых раз'яднаных сем'ях, гэта значыць тых, у каго частка родных і крэўных выехала ў Польшчу ў 1944–1946 гг., а частка засталася ў Беларусі. Шанец на выезд у ПНР мелі і тыя, хто па незалежных ад яго прычынах (хваробы, зняволення, няправільнага афармлення дакументаў і г. д.) не змог перасяліцца ў Польшчу ў сярэдзіне 40-х гг. Адзінай катэгорыяй, ад якой не патрабавалася доказаў польскага грамадзянства, з'яўляліся палітычныя эмігранты і дзеячы польскага рабочага руху, якім дазвалялася бесперашкодна выязджаць у Польшчу. Праект вызначаў умовы рэпатрыяцыі грамадзян, пазбаўленых волі, тых, хто знаходзіўся на прымусовым высяленні, а таксама адзінокіх, родныя і блізкія якіх загінулі падчас вайны. У праекце таксама вызначаліся тэрміны рэпатрыяцыі. Польскі бок вылучыў два варыянты. У адпаведнасці з першым, яе планавалася скончыць да канца 1957 г. Разам з тым польскае міністэрства замежных спраў не адхіляла магчымасць прадаўжэння тэрміну рэпатрыяцыі і пасля 1957 г.

Важнае месца ў праекце занялі пытанні маёмасці, колькасці грошай, якія маглі ўзяць з сабой рэпатрыянты. Перш за ўсё гэта турбавала і клапаціла польскі бок, які добра разумеў, што менавіта польскаму ўраду прыдзецца займацца ўсімі праблемамі, звязанымі з уладкаваннем рэпатрыянтаў на новых месцах. Ад таго, з якой маёмасцю, фінансамі яны прыедуць на сталае месца жыхарства ў Польшчу, залежаў іх дабрабыт, хуткасць сацыяльна-эканамічнай і грамадска-палітычнай адаптацыі ў польскую рэчаіснасць. Таму ў інтарэсах польскага кіраўніцтва было дамагчыся ад савецкага боку дазволу на вываз рэпатрыянтамі як мага больш маёмасці і грошай [11, s. 141]. Цікава адзначыць, што на гэтай сустрэчы польскі бок, а дакладней пасол ПНР у Маскве Т. Гедэ, вылучыў прапанову аб немэтазгоднасці стварэння змешаных савецка-польскіх камісій, як гэта было ў 1945–1946 гг. Ён тлумачыў гэта тым, што ў параўнанні з 1945–1946 гг. рэпатрыяцыя ахопіць меншую частку палякаў і падкрэсліў, што пашпартна-рэжымныя аддзелы ў поўнай ступені будуць прадстаўляць і польскі бок [9, s. 117].

Праект, які падрыхтавала польскае МЗС, быў абмеркаваны на нарадзе ў Савеце Міністраў ПНР з удзелам намесніка міністра замежных спраў Польшчы М. Нашкоўскага, пасла ПНР у СССР Тадэуша Гедэ, шэрага высокапастаўленых супрацоўнікаў МЗС Польшчы. На гэтай жа нарадзе была вызначана ўрадавая дэлегацыя, якая павінна была выехаць у Маскву для перамоў і падпісання савецка-польскага пагаднення аб рэпатрыяцыі. У яе склад увайшлі міністр замежных спраў А. Рапацкі, міністр унутраных спраў Польшчы У. Віха, упаўнаважаны польскага ўрада ў справах рэпатрыяцыі З. Шнек, упаўнаважаны бюро польскага ўрада ў справах рэпатрыяцыі пры пасольстве Польшчы ў Маскве М. Попель і Л. Шыбек [11, s. 146]. Удзельнікі нарады ў асноўным пагадзіліся з праектам, і 12 студзеня 1957 г. ён быў перададзены кіраўніку IV Еўрапейскага аддзела МЗС Савецкага Саюза А. Гарчакову [11, s. 147].

Аднак МЗС СССР, атрымаўшы адпаведныя дакументы з Варшавы, не спяшалася з адказам. «Запаволенасць» Маквы з адказам тлумачылася тым, што ў МЗС СССР вельмі ўважліва аналізавалі прадстаўленыя палякамі дакументы. 22 лютага Т. Гедэ накіраваў міністру замежных спраў Польшчы А. Рапацкаму шыфратэлеграму, у якой паведамляў аб сваёй сустрэчы і размове з А. Грамыка. Т. Гедэ падкрэсліваў: «На маё пытанне аб тэрміне перамоў аб рэпатрыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ны [...] Грамыка адказаў, што савецкі бок сур'ёзна да іх рыхтуецца. Прапрацоўвае свой тэкст праекта з улікам нашага праекта». (Звяртаю ўвагу, што для нас гэта надта нявыгадна, бо азначае непрыняцце нашага праекта за аснову для дыскусіі» [9, s. 111]. Як вынікае з заўвагі польскага пасла, у знешнепалітычным ведамстве СССР з усёй сур'ёзнасцю і адказнасцю падышлі да разгляду польскага праекта. Гэта магчыма растлумачыць тым, што МЗС СССР жадала пазбегнуць тых пралікаў і памылак, якія мелі месца пры ажыццяўленні абмену насельніцтвам у 1944–1946 гг. паміж БССР, УССР і ЛітССР і Польшчай, а таксама рэпатрыяцыі палякаў з СССР у Польшчу на аснове савецка-польскага Пагаднення ад 5 ліпеня 1945 г.

28 лютага 1957 г. у Маскве адбылася сустрэча пасла Польшчы ў СССР Т. Гедэ і Упаўнаважанага польскага ўрада ў справах рэпатрыяцыі пры пасольстве ПНР у СССР М. Попеля з міністрам унутраных спраў СССР М. Дударавым, на якой абмяркоўваўся праект Пагаднення аб рэпатрыяцыі палякаў з СССР у Польшчу. Бакі абмяркоўвалі пытанні магчымасці стварэння бюро ўпаўнаважаных, як гэта было ў 1944–1946 гг., умовы рэпатрыяцыі зняволеных, якія знаходзілі ў турмах, крытэрыі вызначэння нацыянальнасці і г. д. Паколькі рэпатрыяцыя ўжо ішла, польскі бок звярнуў увагу М. Дударава на тое, што найгорш працуюць пашпартна-рэгістрацыйныя аддзелы (ПРА) у Маладзечанскай, Гродзенскай і Полацкай абласцях, што выклікала заклапочанасць польскага боку. Намеснік міністра унутраных спраў Васільеў запытаў палякаў, што найбольш перашкаджае працы на гэтай тэрыторыі. М. Попель патлумачыў, што ад палякаў, якія жадаюць рэпатрыіравацца, патрабуюць замест аднаго некалькі дакументаў – выпіску ад родных, якія стала пражываюць у Польшчы, ці тлумачэння, чаму не выехалі ў 1944–1946 гг. [11, s. 85]. Т. Гедэ прапанаваў, каб сумесная польска-савецкая камісія выехала на некалькі дзён ва ўзгаданыя вобласці і на месцы высветліць, як афармляюцца дакументы. Аднак павагаўшыся, савецкі бок не пагадзіўся з яго меркаваннямі, і палякі, заўважыўшы гэта, не рашыліся настойваць на сваёй прапанове[11, s. 86].

Наступная сустрэча бакоў адбылася 9 сакавіка 1957 г., калі польская дэлегацыя ў складзе Т. Шнека, С. Шыбека, М. Попеля і першага сакратара пасольства ПНР у Маскве Й. Банасяка сустрэлася з савецкай дэлегацыяй, у якую ўваходзілі: загадчык IV Еўрапейскім аддзелам МЗС СССР А. Гарчакоў, намеснік юрыдычна-прававога аддзела МУС А. Сіроцін і намеснік Генеральнага пракурора Дз. Салін [10, s. 148]. Перамовы пачаліся з прадстаўлення польскаму боку савецкага праекта Пагаднення аб рэпатрыяцыі. Масква пагадзілася з тым, каб магчымасць выезду ў Польшчу мелі людзі, якія з'яўляліся польскімі грамадзянамі да 17 верасня 1939 г. і па нацыянальнасці з'яўляліся палякамі і яўрэямі. Рэпатрыяцыя павінна была адбывацца выключна ў індывідуальным парадку. Рэпатрыянт павінен быў выехаць у Польшчу да канца бягучага 1957 г., а хадайніцтва на выезд неабходна было падаць да 1 снежня 1957 г. У адрозненне ад польскага, савецкі праект Пагаднення быў больш агульным. Напрыклад, у ім не знайшлі адлюстравання такія пытанні, як магчымасць доступу да вязняў, якія знаходзіліся ў савецкіх турмах, спосаб разгляду і рашэння спрэчных пытанняў. Тым не менш Т. Гедэ пасля азнаямлення з савецкім праектам станоўча яго ацаніў і ў пасланні да прэм'ер-міністра ПНР Ю. Цыранкевіча падкрэсліў, што «[...] прыняцце савецкага праекта дало б значны палітычны эфект» [11, s. 151]. У Варшаве, атрымаўшы паведамленне пасла, а таксама азнаёміўшыся з вынікамі перамоў у Маскве, палічылі неабходным «[...] у асноўным прыняць савецкія прапановы» [11, s.152]. Адзначу, што перамовы ішлі вельмі складана, у напружанай нервовай абстаноўцы і кампрамісы дасягаліся з цяжкасцю. Асабліва гэта датычыла перамоў, якія адбыліся 21 сакавіка. Так, некаторыя прапановы палякаў савецкая дэлегацыя адхіліла і катэгарычна адмаўлялася іх уключаць у тэкст Пагаднення. Т. Гедэ на наступны дзень пасля перамоў (22 сакавіка 1957 г.) паведамляў у МЗС Польшчы, што савецкі бок не прыняў і не пагадзіўся ўключыць у Пагадненне такія важныя прапановы палякаў, як магчымасць выезду ў рэгёны польскіх прадстаўнікоў, непасрэднага кантакту з прадстаўнікамі мясцовай улады, а таксама з людзьмі, якія хадайнічаюць аб рэпатрыяцыі, і вязнямі; абавязковае прыняцце мясцовымі ўладамі заяў ад жадаючых рэпатрыіравацца і абавязковае паведамленне грамадзянам прычын адмовы ў праве рэпатрыяцыі. Т. Гедэ асабліва падкрэсліваў, што «найслабейшым месцам Пагаднення і пратакола да яго з'яўляецца тое, што савецкі бок не пагадзіўся на самастойны выезд у рэгёны, на сумесны кантроль за ходам рэпатрыяцыі і наша сумеснае супрацоўніцтва ў яе рэгуляванні. Наша дэлегацыя асэнсоўвала, што савецкі бок не пойдзе на большыя саступкі. Ход перамоў быў цяжкі, атмасфера на іх нацягнутай і халоднай» [9, s. 150–151].

Адзначым, што на заключным этапе савецка-польскіх перамоў і падпісанні Пагаднення прысутнічалі прадстаўнікі Украіны, Беларусі, Літвы. Польская прэса вельмі коратка паведамляла, што «ў размовах удзельнічалі ў якасці «запрошаных» прадстаўнікі Украіны – А. Магіла,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Беларусі – М. Крыштафовіч*, Літвы – І. Гашка». Аднак невядома, якая была іх роля, паўнамоцтвы, якія задачы ставіліся перад імі ўрадамі саюзных рэспублік. Невядома таксама, ці прымалі яны ўдзел у дыскусіях па абмяркоўваемых пытаннях, якія ўносілі прапановы і калі ўносілі, ці былі яны прынятыя і г. д. Хутчэй за ўсе, паколькі з гэтых рэспублік павінна была ажыццяўляцца рэпатрыяцыя, не запрасіць іх прадстаўнікоў на перамовы саюзнае кіраўніцтва не магло, па-першае. Па-другое, галоўная роля, безумоўна, належала дэлегацыі, якая прадстаўляла саюзныя органы ўлады. Рэспубліканскім прадстаўнікам, у лепшым выпадку, адводзілася другасная роля, калі не роля статыстаў. Невядома, хто прыняў рашэнне аб накіраванні М. Крыштафовіча, «шэрагавага» дэпутата Вярхоўнага Савета БССР, у Маскву на падпісанне савецка-польскага Пагаднення аб рэпатрыяцыіі. Магчыма меркаваць, не апошнюю ролю тут адыграла тое, што ён у свой час з'яўляўся актыўным дзеячам КПЗБ, а ў адзначаны перыяд – намеснікам старшыні Брэсцкага аблвыканкама, таму ведаў польскую праблематыку.

«Пагадненне паміж урадам Польскай Рэспублікі і ўрадам СССР у справе тэрміну і парадку рэпатрыяцыі з СССР грамадзян польскай нацыянальнасці» было падпісана 25 сакавіка 1957 г. Пагадненне ўтрымлівала 17 артыкулаў і строга рэгламентавала парадак выезду. Так, рэпатрыянты мелі права выязджаць індывідуальна і толькі на аснове дакументаў, якія выдаваліся мясцовымі аддзеламі міліцыі. Выезд павінен быў адбыцца на працягу трох месяцаў са дня іх атрымання. Па заканчэнні гэтага тэрміну людзі трацілі такую магчымасць і не маглі абскардзіць ці яшчэ раз звярнуцца за дазволам на рэпатрыяцыю. Палякі дабіліся даўжэйшага тэрміну рэпатрыяцыі. Так, заявы на рэпатрыяцыю прымаліся да 1 кастрычніка 1958 г., а выязджаць маглі да канца гэтага ж года. Рэпатрыянты набывалі польскае грамадзянства з моманту перасячэння савецка-польскай дзяржаўнай мяжы. У Пагадненні вызначалася, што работнікі пэўных спецыяльнасцей (навукоўцы, урачы, рамеснікі) маглі браць з сабой і вывозіць у Польшчу прылады працы, якія патрэбны ім да выканання іх прафесійных абавязкаў [4, с. 101–103]. Да яго дадаткова далучаўся пратакол, які ўтрымліваў 11 пунктаў, але не быў прызначаны для публікацыі ў прэсе. Ён меў не менш важнае значэнне, чым Пагадненне, бо тлумачыў і ўдакладняў некаторыя яго пункты. Так, п. 3 пазначаў, што члены сямей, выязджаючых на аснове арт. 4 Пагаднення, абавязаны прадставіць дакументы, якія пацвярджаюць ступень іх радства і сумеснае вядзенне гаспадаркі. Важным з фінансавага пункту гледжання з'яўляўся п. 4, які сцвярджаў, што савецкі бок не пакрывае затрат, звязаных з пераездам рэпатрыянтаў, членаў іх сямей, а таксама перавозкай іх маёмасці па тэрыторыі Савецкага Саюза. Фактычна гэтым пунктам кіраўніцтва Савецкага Саюза перакладала на плечы рэпатрыянтаў увесь фінансавы цяжар пераезду. Разам з тым савецкі бок пагадзіўся аплаціць праезд вязням, датэрмінова вызваленым з турмаў да месца пражывання іх родных, а ў выпадку іх адсутнасці да савецка-польскай мяжы. П. 5–6 датычылі ўмоў рэпатрыяцыі тых, хто знаходзіўся ў турмах, лагерах, спецпасяленнях. Астатнія п. 7–11 вызначалі ўмовы атрымання рэпатрыяцыйных пасведчанняў і звальнення з працы, пры неабходнасці стварэнне змешаных камісій і выездзе іх членаў у рэгіёны ў выпадку ўзнікнення спрэчных пытанняў, абмен аблігацый дзяржаўнага займу, атрымання натарыяльна заверaных даведак аб стажы працы [10, s. 96–97].

Пагадненне 1957 г. мела шмат агульных рыс з Пагадненнямі, якія заключылі ў 1944 г. БССР, УССР, ЛітССР з Польскім Камітэтам Нацыянальнага Вызвалення (ПКНВ). Разам з тым яго асобныя артыкулы былі больш дакладна сфармуляванымі, не дапускалі рознагалоссяў і рознатлумачэнняў. Так, рэпатрыяцыя адбывалася ў адпаведнасці з прынцыпам *грамадзянскай і нацыянальнай прыналежнасці*, які вызначаў, што «асобы, якія жадаюць рэпатрыіравацца [...], падаюць ва ўстановы міліцыі па месцы пражывання заявы аб жаданні рэпатрыіравацца з далучэннем дакументаў, якія пацвярджаюць польскую нацыянальнасць і былое польскае грамадзянства» [4, с. 101]. У беларуска-польскім Пагадненні 1944 г. гэта палажэнне было больш «расплывістым»: «Упаўнаважаныя і Прадстаўнікі кожнага боку [...] атрымліваюць заявы ад жадаючых эвакуіравацца (у пісьмовай або вуснай) форме, па магчымасці з дакументамі аб нацыянальнасці» [5, л. 32]. Як вынікае, розніца ў фармулёўках была вельмі істотная, што прывяло да значнага абмежавання колькасці жадаючых рэпатрыіравацца. У другой палове 50-х гг., г. зн. амаль праз 13 год пасля заканчэння вайны, для многіх людзей дакументальна пацвердзіць польскае грамадзянства і нацыянальнасць было дастаткова цяжка і праблематычна. У пасляваенны час адбылася

* Крыштафовіч Мірон Емяльянавіч – удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, адзін з арганізатараў партызанскага руху і антыфашысцкага падполля ў Брэсцкай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З ліпеня 1944 г. старшыня Пружанскага райвыканкама, у 1947–1961 гг. – намеснік старшыня, 1-ы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама. У 1951–1955, 1959–1963 – дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. [Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 4. / Беларус. Энцыкл. Рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн. 1997. – С. 284.]. У 1948 г. М. Крыштафовіч быў упаўнаважаным СМ БССР пры перасяленні беларускага насельніцтва пры дэмаркацыі савецка-польскай мяжы. – *А.В.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пашпартызацыя і польскія ці акупацыйныя нямецкія дакументы, у якіх была пазначана польская нацыянальнасць і грамадзянства забіраліся і людзям выдаваліся савецкія пашпарты, у якія ўпісвалася «эсэсэсэраўскае» грамадзянства. У параўнанні з сярэдзінай 40-х гг. значна абмяжоўваўся вываз маёмасці. Калі ў 1944–1946 гг. гаспадар, які выязджаў у Польшчу, мог узяць з сабой 2 т маёмасці, то паводле Пагаднення 1957 г. «асобы [...] могуць без мыты вывезці належачую ім маёмасць для асабістага карыстання» [4, с. 102]. Людзі былі вымушаны самі распрадаваць ці давяраць знаёмым, блізкім, сябрам продаж іх маёмасці і пералічэнне грошай на спецыяльны рахунак пасольства Польшчы ў СССР, каб апошняе пералічвала іх ў Польшчу, дзе яны іх атрымоўвалі. Аднак гэта займала ні дзень і ні два, і пераўтваралася ў доўгую валакіту, у той час як рэпатрыянтам неабходны былі грошы для набыцця самых неабходных рэчаў. Дыскрымінацыйным, на наш погляд, з'яўляўся артыкул 15, у адпаведнасці з якім права рэпатрыяцыі былі пазбаўлены тыя людзі, якія «эвакуіраваліся» з Польшчы ў СССР у 1944–1947 гг. [4, с. 103].

Пагадненне было даволі агульным, таму ўжо пасля яго падпісання прыйшлося ўдакладняць і ўносіць дапаўненні ў шэраг яго артыкулаў. Так, гэта праявілася адносна рэпатрыяцыі тых, хто служыў у Чырвонай Арміі і праходзіў службу ў розных рэгіёнах Савецкага Саюза. Увагу на дадзеную праблему звярнуў у лісце, накіраваным яшчэ ў лістападзе 1956 г. міністру ўнутраных спраў СССР М. Дудараву, Упаўнаважаны ў справах рэпатрыяцыі пры пасольстве Польшчы ў Маскве С. Каліноўскі. Супрацоўнікі МУС правялі кансультацыі з міністэрствам абароны СССР, а 8 красавіка 1957 г. Галоўнакамандуючы сухапутнымі вайскамі СССР выдаў загад, у адпаведнасці з якім асобы польскай і яўрэйскай нацыянальнасці, якія жадалі рэпатрыіравацца, павінны былі падаць рапарт на імя камандзіра вайсковай часці, дзе яны служылі з дадатковымі дакументамі, што пацвярджалі іх нацыянальнасць. Камандзіры часцей павінны былі накіроўваць гэтыя дакументы ў бліжэйшыя аддзелы МУС. Пры станоўчым разглядзе дакументаў і выдачы дазволу на рэпатрыяцыю аддзелы МУС паведамлялі аб гэтым камандзірам вайсковых часцей. Даведкі з аддзелаў міліцыі з'яўляліся асновай для тэрміновага звальнення салдат ці афіцэраў з арміі. Камандаванню воінскіх часцей загадвалася забяспечыць ваеннаслужачых білетамі да месца пражывання бацькоў, а калі яны жадалі пераязджаць прама ў Польшчу, то іх павінны былі забяспечыць білетамі да Брэста (БССР) ці да станцыі Масціска (УССР) [3, л. 14–15].

Польская грамадскасць сустрэла гэту падзею з вялікім задавальненнем і як значны поспех польскай дыпламатыі. Так, «Trybuna ludu», ацэньваючы падпісанае Пагадненне, адзначала, што «[...] яно развязвае пытанне рэпатрыяцыі з СССР грамадзян польскай нацыянальнасці» [11, s. 159].

Падпісанае 25 сакавіка 1957 г. Пагадненне афіцыйна ўступіла ў сілу 10 ліпеня 1957 г. У гэты дзень у Варшаве намеснік міністра ўнутраных спраў Польшчы Л. Віневіч і пасол СССР у Польшчы П. Панамарэнка абмяняліся ратыфікацыйнымі граматамі, бо Сейм ПНР 28 мая 1957 г. ратыфікаваў Пагадненне. У Савецкім Саюзе яно было ратыфікавана Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР 5 чэрвеня гэтага ж года [11, s. 159].

Такім чынам, амаль двухгадовыя настойлівыя і паслядоўныя намаганні польскага боку скончыліся поспехам. Савецкі бок, улічваючы настойлівыя патрабаванні палякаў, вымушаны быў пайсці на ўступкі і пагадзіўся на рэпатрыяцыю. Пагадненне стала асноўнай нарматыўна-прававой базай, якая давала сотням тысяч палякаў у Савецкім Саюзе магчымасць рэпатрыяцыі ў Польшчу. Для рэспублікі гэта Пагадненне мела самае непасрэднае і надзвычай важнае значэнне, бо яго дзейнасць распаўсюджвалася і на БССР. У адпаведнасці з Пагадненнем, беларускія палякі мелі права рэпатрыіравацца з Беларусі ў ПНР. Яно вызначала, хто і на якіх умовах мае права на рэпатрыяцыю, колькасць і пералік маёмасці, якую дазвалялася вывозіць у Польшчу, парадак афармлення дакументаў, праезд праз мяжу і г. д. На яго аснове ў 1957–1959 гг. з БССР у Польшчу выехала 88 546 палякаў [1, с. 205].

*Літаратура і крыніцы*


1. *Вялікі, А.Ф.* Беларусь–Польшча ў ХХ стагоддзі. Невядомая рэпатрыяцыя. 1957–1959 гг.; манаграфія / А.Ф. Вялікі; навук. рэд. канд. гіст. навук В.Дз. Селяменеў. – Мінск: БДПУ, 2007.
2. *Вялікі, А.* Беларусь у еўрапейскіх перасяленчых працэсах 30 – 50-х гг. ХХ ст. / А. Вялікі // Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя: матэрыялы IV Міжнар. кангр. белраусістаў «Беларуская культура ў кантэксце культур еўрапеейскіх краін», Мінск, 6–9 чэрв. 2005 г. / адк. рэд. Мальдзіс, А. Смалянчук. – Мінск: газ. «Голас Радзімы», 2006. – С. 336–343.
3. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Фонд. Р-9415. – Воп. 3. – Спр. 1459.
4. Документы и материалы по истории советско-польских отношений. В 12 т. / ред. кол. И.А. Хренов, В.Т. Ковальский [и др.]. – М.: Наука, 1976. – Т. XI: январь 1946 г. – декабрь 1949 г.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 788. – Воп. 1. – Спр. 1. Распараджэнні і перапіска з СМ (СНК) БССР аб арганізацыі і правядзенні эвакуацыі насельніцтва. 9 верасня 1944 г. – 31 мая 1946 г.
6. *Снапкоўскі, У.Е.* Савецка-польскія пагадненні аб абмене насельніцтвам 1944–1945, 1957 г. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі / гал. рэд Г.П. Пашкоў. – Мінск: БелЭн., 2001. – Т. 6. Кн. 1. – С. 197–198.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

7. *Снапкоўскі, У.Е.* Гісторыя знешняй палітыкі Беларусі: вучэб. дапам. для студ. фак. міжнар. адносін. У 2 ч. Ч. 2. Ад канца XVIII да пачатку XXI ст. / У.Е.Снапкоўскі. – Мінск: БДУ, 2004.
9. *Толстой, В.С.* Братское сотрудничество белорусского и польского народов 1944–1964 / В.С. Толстой. – Минск: «Наука и техника». – 1966.
8. Polskie dokumenty dyplomatyczne. 1957. Red. K. Ruchniewicz, T. Szumowski. Polski Instytut Spraw Miedzynarodowych. – Warszawa, 2006.
9. *Kacka, B. Stepka, S.* Repatriacja ludnosci polskiej z ZSRR 1955–1959. Wybor dokumentow / B. Kacka, S. Stepka. – Warszawa, 1994.
10. *Ruchniewich, M.* Repatriacja ludnosci polskiej z ZSRR w latach 1955–1959 / M. Ruchniewich. – Warszawa, 2000.



SUMMARY

*The Soviet-Polish Agreement of the repatriation of Poles from Soviet Union to Poland during 1957–1959 had great importance for Poles which lived in Belarus. According to the Agreement, Poles of Belarus had an opportunity to repatriate to Poland.*


*УДК [947.6:272] «1773/1826»*


***М.А. Папоў,***

***аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу БДУ***


# ДАПАМОЖНЫЯ БІСКУПЫ МАГІЛЁЎСКАГА РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА АРХІБІСКУПСТВА Ў ЭПОХУ МІТРАПАЛІТА СТАНІСЛАВА БОГУША-СЕСТРАНЦЭВІЧА (1773–1826 гг.)

***Уводзіны.*** 2000-я гг. у развіцці гістарычнай навукі Беларусі характарызуюцца ажыўленнем цікавасці да вывучэння канфесіянальнай гісторы. Адным з маладаследаваных аспектаў у дадзенай галіне з'яўляецца праблема вывучэння царкоўна-адміністрацыйнай структуры, а таксама жыцця і дзейнасці царкоўных іерархаў. Артыкул напісаны па матэрыялах інфармацыйных працэсаў, якія захоўваюцца ў Ватыканскай Апостальскай бібліятэцы і распараджэннях расійскага ўрада, змешчаных у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі і Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве. Яны заклінаны ліквідаваць адсутнасць у айчыннай і замежнай гістарыяграфіі даследаванняў, прысвечаных вывучэнню жыцця і царкоўнай дзейнасці рымска-каталіцкіх дапаможных біскупаў у 1773–1826 гг. (у эпоху мітрапаліта Станіслава Богуша-Сестранцэвіча).

***Дапаможныя біскупы на ўсходнебеларускіх землях у 1772–1783 гг.***

Гістарычныя крыніцы сведчаць, што 5 жніўня 1772 г. адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай. З пункту гледжання тэрытарыяльна-адміністрацыйнай структуры Рымска-каталіцкай Царквы да Расіі былі далучаныя прыходы Смаленскай, Віленскай і Інфлянцкай дыяцэзій [1, с. 284]. Усяго 106 храмаў і каля 90 тыс. рымскіх каталікоў. У межах імперыі імянным указам ад 25 снежня 1772 г. было створана Беларускае рымска-каталіцкае біскупства, на чале якога 3 снежня 1773 г. быў прызначаны С. Богуш-Сестранцэвіч. Святая Сталіца не прызнала падобную рэарганізацыю тэрытарыяльнай структуры. З пункту гледжання царкоўнага права на далучаных да Расіі беларуска-латвійскіх землях працягвалі існаваць 3 дыяцэзіі, архірэі якіх прызначылі туды сваіх прадстаўнікоў (суфраганаў, генеральных вікарыяў).

На тэрыторыі Віленскай дыяцэзіі з 1652 г. існаваў Беларускі суфраганат. З 1 кастрычніка 1766 г. беларускім дапаможным біскупам з'яўляўся Фелікс Тавянскі[1].

Пасля ўваходжання большасці прыходаў беларускага суфраганата ў склад Расійскай імперыі ён адмовіўся прынесці прысягу і пасяліўся ў Вільні.

Замест Ф. Тавянскага 14 чэрвеня 1773 г. дапаможным біскупам беларускім быў прызначаны віленскі канонік Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч, які 12 ліпеня 1773 г. узведзены ў сан тытулярнага біскупа маленскага [3, с. 274; 4, л. 5–5 адв.]. Сваім вікарыем яго прызнаў таксама смаленскі біскуп Габрыэль Вадзінскі.

Біскупам-суфраганам над далучанымі да Расіі прыходамі Інфлянцкага біскупства быў пер-

[1] **Фелікс Тавянскі** ахрышчаны 29 кастрычніка 1719 г. у Відзінішках (Пабойскі дэканат Віленскай дыяцэзіі). У няпоўных 19 гадоў (20 жніўня 1738 г.) прыняў духоўны сан з рук віленскага біскупа М. Зянковіча і ўступіў у ордэн францысканцаў канвентуальных у Вільні [1, л. 124]. 24 снежня 1740 г. быў пасвечаны ў субдыяканы, 22 снежня 1742 г. – у дыяканы, 27 мая 1743 г. – у святары [2, л. 124 ад.]. Пасля нядоўгачасовага навучання ў Віленскай езуіцкай акадэміі быў адпраўлены ордэнскім начальствам у Рым у калегіум святога Банавентуры [1, л. 119 ад.], дзе абараніў доктарскую дысертацыю па тэалогіі. Пасля вяртання ў Вялікае княства Літоўскае быў прызначаны кіраўніком ордэнскай адукацыі [2, л. 120]. У 1760 г. стаў літоўскім правінцыялам францысканцаў канвентуальных [2, л. 120]. Па сканчэнні падвойнага тэрміну правінцыяльства 1 кастрычніка 1766 г. прызначаны віленскім біскупам І. Масальскім суфраганам беларускім і 1 снежня 1766 г. быў узведзены Рымскім Папам у сан тытулярнага біскупа Карпаскага [3, с.148].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ